# Што слова, то навука

## *Кірункі працы з фразеалагічнымі адзінкамі на ўроках беларускай мовы*

Фразеалогія з'яўляецца своеасаблівым люстэркам, у якім знаходзіць адбітак нацыянальная самасвядомасць. Фразеалагізмы маюць яркі нацыянальны характар і выступаюць захавальнікамі гісторыі народа, адметнасці яго культуры і побыту.

Выкарыстанне фразеалагізмаў носьбітам мовы сведчыць пра добрае валоданне ёй. Чым больш фразеалагічных адзінак ведае чалавек, тым больш выразная і яскравая яго мова.

У канцэпцыі вучэбнага прадмета "Беларуская мова" ў якасці аднаго з зыходных тэарэтычных палажэнняў замацавана раскрыццё культурнага патэнцыялу роднай мовы. Гэта патрабуе ад настаўнікаў пачатковых класаў звароту да культурна маркіраваных моўных адзінак.

Фразеалагізмы не з'яўляюцца аб'ектам спецыяльнага вывучэння на ўроках беларускай мовы ў пачатковых класах. Аднак многія тэмы школьнага курса мовы ў II—IV класах даюць магчымасць паназіраць за ўжываннем фразеалагічных адзінак у маўленні, засвоіць этыкетныя словы і выразы.

Акрамя таго, у падручніках па беларускай мове і літаратурным чытанні для II—IV класаў сустракаецца вялікая колькасць фразеалагізмаў, многія з якіх патрабуюць ад настаўніка спецыяльна арганізаванай працы па тлумачэнні іх значэння і актывізацыі ў маўленні вучняў.

Азнаямленне з фразеалагічнымі адзінкамі трэба арганізоўваць з улікам унутраных сэнсавых сувязей паміж імі. У гэтым выпадку будуць развівацца пазнавальныя здольнасці вучняў, цікавасць да мовы.

Працу з фразеалагічнымі адзінкамі ў пачатковых класах пажадана накіроўваць на:

- распазнаванне, знаходжанне ў тэкстах фразеалагічных адзінак;
- тлумачэнне значэння тых фразеалагізмаў, якія змяшчаюцца ў падручніках і актыўна ўжываюцца настаўнікам, бацькамі, дзецьмі ў вусным маўленні;
- ужыванне фразеалагізмаў у маўленні (часцей вусным) у адпаведнасці з іх значэннем;
- ілюстраванне, пацверджанне прыкладамі засвоеных фразеалагічных адзінак;
- групоўку вядомых вучням фразеалагізмаў [1].

Так, пры засваенні правапісу слоўнікавых слоў *месца*, *адказ*, *звінець*, *секунда* (II—IV класы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання) можна выкарыстоўваць наступныя ***заданні***, якія дапамогуць не толькі выпрацаваць арфаграфічныя навыкі, але і ўзбагаціць слоўнік вучняў фразеалагічнымі адзінкамі.

**1** Што абазначае выраз? Злучыце выраз з яго значэннем.

**да месца**

- падысці да патрэбнай лініі
- якраз які трэба, адпаведны абставінам

**2** Прачытайце размову маці з дачкой.

— Матуля, дазволь памераць твае пацеркі і пярсцёнкі, — папрасіла Насця.

— Бяры... — уздыхнула маці. — Але памятай: упрыгажэнні дзецям не **падыходзяць** (____________________). Ты сама па сабе прыгожая!

**3** Які выраз магла выкарыстаць маці замест слова **падыходзяць**? Дапішыце гэты выраз у дужках.

**1** Што абазначае выраз? Злучыце выраз з яго значэннем.

**да адказу**

- поўнасцю, да канца
- часткова

**2** Якім выразам можна замяніць спалучэнне слоў у левым слупку? Пакажыце стрэлкай.

**да адказу**

- вераб'ю па калена
- назаўсёды
- пад завязку

3 Прачытайце сказ. Які выраз можна выкарыстаць замест выдзеленага слова? Дапішыце гэты выраз у дужках.

Аленка напоўніла (________________) **увесь** кошык малінамі.

1 Што абазначае выраз? Злучыце выраз з яго значэннем.

**звініць у вушах**

- як быццам чуецца
- ледзьве чуецца
- чуецца гук званка

2 Прачытайце размову маці з дзецьмі. Чаму ў час навальніцы знаходзіцца ў лесе небяспечна?

— Як добра, што вы вярнуліся, — сказала ўстрывожаная маці.

— Нам стала вельмі страшна. Нечакана паліў дождж, пачала бліскаць маланка. Моцна загрымеў гром. Мне гэты рокат і зараз **чуецца** (______________________________), — усхвалявана расказвала Алеся.

— Я вырашыў, што ў такое надвор'е збіраць грыбы нельга, трэба вяртацца дамоў, — дадаў старэйшы брат Андрэй.

— Вы правільна зрабілі, дзеці. Знаходзіцца ў лесе ў час навальніцы небяспечна! — сказала маці.

3 Які выраз можна выкарыстаць замест выдзеленага слова? Дапішыце гэты выраз у дужках.

1 Што абазначаюць выразы? Злучыце выразы з іх значэннем.

| | |
|---|---|
| **секунда ў секунду** | у самым хуткім часе, вось-вось |
| **з секунды на секунду** | у дакладна акрэслены час, зусім ненадоўга |
| **на секунду** | у дакладна акрэслены час |

2 Дапоўніце сказ патрэбным выразам.

У прызначаны час — ____________________ ____________ — сябры сустрэліся на стадыёне.

3 Прачытайце тэкст.

Настаўніца з вучнямі збіраліся пайсці ў тэатр. Дамовіліся сустрэцца каля школы. У прызначаны час прыйшлі ўсе, акрамя Мішы.

Настаўніца запытала:

— Дзеці, хто ведае, чаму спазняецца Міша? Мы можам не паспець у тэатр.

— Ала Віктараўна, не хвалюйцеся. Міша патэлефанаваў і сказаў, што будзе **ў самым хуткім часе** (____________________), — адказала Аленка.

4 Які выраз магла выкарыстаць Аленка замест выдзеленых слоў? Дапішыце гэты выраз у дужках.

Прачытайце спалучэнні слоў. Устаўце прапушчаныя літары. Злучыце паміж сабой выразы, блізкія па значэнні.

| | |
|---|---|
| с_кунда ў с_кунду | на с_кунду |
| з хвіліны на хвіліну | хвіліна ў хвіліну |
| на хвілінку | з с_кунды на с_кунду |

Пры засваенні правапісу прыставак і прыназоўнікаў мэтазгодна выкарыстаць наступнае заданне.

Устаўце ў спалучэнні слоў левага слупка патрэбныя прыназоўнікі. Пакажыце стрэлкамі, якім словам з правага слупка можна замяніць кожнае спалучэнне слоў. У словах правага слупка выдзеліце прыстаўкі.

| | |
|---|---|
| узяць __ душу | неглыбока |
| як _ ваду глядзеў | падманваць |
| паставіць __ ногі | вырасціць |
| вераб'ю __ калена | разбурыць |
| не пакінуць каменя __ камені | усхваляваць |
| вадзіць __ нос | угадаў |

**на** **у** **па** **за**

Пры засваенні правапісу ***не*** з дзеясловамі карысна выканаць такое заданне.

Устаўце ў спалучэнні слоў левага слупка адмоўе ***не***. Злучыце спалучэнні слоў з іх значэннем.

| | |
|---|---|
| __ спускаць вачэй<br>__ зводзіць вачэй | не забываецца |
| __ выходзіць з галавы<br>__ ідзе з думак | глядзець пільна, уважліва, не адрываючыся |
| вады __ замуціць<br>мухі __ пакрыўдзіць | нічога не еў |
| макавага зерня ў роце __ было<br>і расінкі ў роце __ было | ціхі, лагодны, пакорлівы |

Фактычна на кожным уроку беларускай мовы ў III—IV класах мэтазгодна прапаноўваць дзецям ***гульні*** з фразеалагізмамі. Напрыклад, можна збіраць часткі пазлаў, якія падыходзяць па сэнсе і дапамагаюць раскрыць значэнне фразеалагізма, што сустрэўся ў падручніку па беларускай мове або літаратурным чытанні; падбіраць да яго блізкія і супрацьлеглыя па значэнні спалучэнні слоў.

| **ПЕРАД ВАЧЫМА*** | | |
|---|---|---|
| **значэнне** | **сінонімы** | **антонімы** |
| побач, блізка | адзін крок<br>за два крокі<br>не за гарамі<br>пад бокам<br>пад рукой<br>перад носам<br>рукой падаць | за свет вочы<br>за свет<br>дзе макар козы пасе<br>за блізкі свет<br>на край свету<br>куды макар цялят не ганяў |

* Фразеалагізм *перад вачыма* сустракаецца ў апавяданні В. Сумарава “Мой дом” у вучэбным дапаможніку для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання “Літаратурнае чытанне. 4 клас” аўтараў А. Вольскага, І. Гімпель.

| **АБОЕ РАБОЕ**** | | |
|---|---|---|
| **значэнне** | **сінонімы** | **антонімы** |
| аднолькавыя, адзін не лепшы за другога | аднаго крою<br>аднаго поля ягады<br>з аднаго цеста<br>на адзін манер | з іншага цеста<br>не з такога цеста |

** Фразеалагізм *абое рабое* сустракаецца ў тэме “Займеннікі 1, 2, 3-й асобы” ў вучэбным дапаможніку для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання “Беларуская мова. 4 клас” аўтараў Т. М. Валынец, І. Э. Ратнікавай, І. С. Роўды, П. П. Шубы.

Можна прапанаваць вучням ***гульню “Хто больш?”***. Яна арганізоўваецца наступным чынам.

1. На дошцы вывешваецца малюнак рукі.
2. Побач змяшчаюцца сюжэтныя малюнкі, якія ілюструюць сітуацыі выкарыстання фразеалагізмаў, напрыклад: рукі не падаваць, на руках насіць, з рук валіцца, узяць сябе ў рукі, прасіць рукі, не па руках рукавіцы, доўгія рукі, голымі рукамі не возьмеш, майстар на ўсе рукі *(гл. каляровую ўкладку)*.
3. Задачы вучняў — прыгадаць фразеалагізмы па малюнках; успомніць як мага больш фразеалагізмаў, у складзе якіх ёсць слова *рука*.
4. Дапоўніць фразеалагізмамі сказы.

- Каб справіцца з кантрольнай, трэба ________.
- Мы шмат ведаем і ўмеем, таму нас ________.
- Наш дзядуля — сапраўдны ________.

Аналагічную працу можна арганізаваць са словам *вочы* (перад вачыма, вачам сваім не верыць, вочы адбірае), *вушы* (вушы развесіў, за вушы не адцягнеш, натапырыць вушы, адным вухам) і інш.

Такім чынам, праца з фразеалагізмамі ў пачатковых класах развівае цікавасць да роднай мовы, спрыяе фарміраванню ў вучняў эмацыянальна-каштоўнасных адносін да беларускай культуры.

*ЛІТАРАТУРА*


1. Методыка выкладання беларускай мовы : вучэб. дапам. для студэнтаў філалаг. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М. Г. Яленскі [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2007. — 448 с.
2. Лепешаў, І. Я. Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы : у 2 т. / І. Я. Лепешаў. — Мінск : БелЭн, 1993.



**В. І. СВІРЫДЗЕНКА,**
дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя М. Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.


*На дыску — карткі-заданні.*